# СВАБОДА

**НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА** **№ 27 (42), 02 – 08.11. 2006 г.**


# ЗМІЦЕР ДАШКЕВІЧ АСУДЖАНЫ НА ПАЎТАРА ГОДА

## САЛІДАРНАСЦЬ З ІМ ЛЯ СЦЕНАЎ СУДА ВЫКАЗАЛІ СОТНІ ЛЮДЗЕЙ

Гэта ўжо трэці палітычны працэс за менш як чатыры месяцы. У сярэдзіне ліпеня быў асуджаны на пяць з паловай гадоў экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін. На пачатку жніўня два гады калоніі атрымаў Мікола Астрэйка і год – Цімафей Дранчук. Па паўгода атрымалі Эніра Браніцкая і Аляксандр Шалайка. Усе яны былі абвінавачаныя па тым самым артыкуле, што і Дашкевіч — “дзеянні ад імя незарэгістраванай арганізацыі”. У першым выпадку размова ішла пра арганізацыю “Партнёрства”, якая займалася назіраннем за выбарамі, у другім – пра “Малады Фронт”. У абодвух выпадках у справе фігуравалі яўна сфабрыкаваныя абвінавачанні ў тэрарызме.

Агульны пасыл усіх гэтых судовых і пазасудовых расправаў цалкам відавочны – запалохаць усіх, хто не згодны з тым, што зараз адбываецца ў Беларусі і гатовы пратэставаць. Арышт памочніка Мілінкевіча ў Гродне, ператрус на кватэры яшчэ адной ягонай памочніцы, правакацыя з “белым парашком” у аўтамабілі, у якім ехала старшыня Саюза палякаў Беларусі – усе гэта падзеі таго самага шэрагу.

Суд над Дашкевчам паказаў, што ўлада даводзіць механізм рэпрэсіяў да дасканаласці. Па-першае, суд адбыўся ў рэкордна кароткі тэрмін. Суддзі Але Булаш спатрэбілася ўсяго тры дні. Акрамя таго, суд был аб’яўлены закрытым без тлумачэння прычынаў. Пасол ФРГ Хекер у інтэрвью Радыё Свабода нагадаў, што падобныя суды практыкаваліся ў Нямеччыне пры Гітлеры і ў СССР пры Сталіне.

Тым не менш, некалькі сотняў людзей – пераважна маладых, не збаяліся прыходзіць у гэтыя дні да Дому правасуддзя (сама назва гучыць як злая іронія), каб падтрымаць Змітра Дашкевіча.

Кажуць, што яму ўдалося бачыць “ланцуг салідарнасці” ў першы дзень працэсу, потым вокны ў будынку былі шчыльна завешаныя. Але акцыю салідарнасці не маглі не заўважыць і тысячы іншых людзей. І не толькі, як можна спадзявацца, за межамі Беларусі.

**А. Уласаў**




**Салідарнасць са Змітром Дашкевічам** *выказвае адна з удзельніц акцыяў у яго падтрымку, якія адбываліся перад Домам правасуддзя ўсе тры дні, пакуль ішоў працэс. Мінск, 31 кастрычніка 2006 году.*

## ЕЎРАСАЮЗ УЗНАГАРОДЗІЎ МІЛІНКЕВІЧА

### ВОДГУКІ І МЕРКАВАННІ

► СТАР. 2, 3

## АПЕРАЦЫЯ «БЕЛЫ ПАРАШОК» ПРАВАКАЦЫЯ НА МЯЖЫ

► СТАР.5

# ЯК ВЫ АЦЭНЬВАЕЦЕ ПРЫСУДЖЭННЕ ПРЭМІІ ЕЎРАПАРЛАМЕНТА АЛЯКСАНДРУ МІЛІНКЕВІЧУ?

**АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ, ПРАВААБАРОНЦА:**

## “ГЭТА ПРЭМІЯ ЎСІМ ЛЮДЗЯМ, ШТО ІШЛІ НА АХВЯРЫ”

Я рады за Мілінкевіча, таму што пачынаючы з восені мінулага году і асабліва падчас гэтай вясны, цягам некалькіх месяцаў напружанай выбарчай кампаніі ён паказаў сябе з лепшага боку. Ён вытрымаў гэты каласальны прэсінг, каласальную адказнасць, якая была асабліва высокай падчас гарачых сакавіцкіх дзён. Мілінкевіч паводзіў сябе годна. Да таго ж, мы цудоўна разумеем, што гэтая прэмія — не столькі персанальна яму, колькі ўсім дэмакратычным сілам, усім, хто сядзеў “на стуках”, тысячам людзей, якія свядома ішлі на асабістыя ахвяры гэтай вясной. Гэтая прэмія ёсць знакам павагі Еўрасаюза да Беларусі. Для нас вельмі важна, што тэматыка Беларусі не сыходзіць з-пад увагі еўрапейскіх палітыкаў.

**ВАСІЛЬ, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## “ЕЎРОПА АДКУПІЛАСЯ АД ПРАБЛЕМЫ”

Мне, канечне, вельмі прыемна, што мой суграмадзянін патрапіў у адзін шэраг з Нэльсанам Мандэлам. Хоць, па-шчырасці, асабіста я не ведаю асаблівых заслугаў Аляксандра Мілінкевіча ў справе абароны правоў чалавека. І падазраю, што гэтай прэміяй Еўропа чарговы раз адкупілася ад праблемы. Адкупілася, безумоўна, прыгожа. Але толку ад гэтага не паболее. Дзе іхнія эканамічныя санкцыі? Дзе незалежны спадарожнікавы тэлеканал? Дзе моцныя радыёперадатчыкі? Няма. Затое Мілінкевіча некалькі разоў паказалі на канале “Еўраньюс”.

**СЯРГЕЙ АЛЬФЕР, ПАЛІТОЛАГ:**

## “ГЭТА МАРАЛЬНЫ АВАНС ЕЎРАПЕЙСКІХ СТРУКТУР”

Вельмі прыемна, што дзейнасць аб’яднаных дэмакратычных сіл Беларусі была ацэнена такім чынам. Мы расцэньваем прэмію імя Сахарава не як заслугу аднаго чалавека, а як заслугу ўсіх аб’яднаных дэмакратычных сіл, якія падчас гэтай выбарчай кампаніі паказалі, што яны могуць працаваць разам і разам дабівацца нейкіх зрухаў. Каб Беларусь ішла наперад. А прэмія – гэта, напэўна, маральны аванс еўрапейскіх структур, каб мы і далей працавалі разам, каб у Беларусі было пабудавана дэмакратычнае грамадства.

**АНДРЭЙ КЛІМАЎ, ПАЛІТЗНЯВОЛЕНЫ:**

## “ГЭТА СВЕДЧЫЦЬ, ШТО МЫ ЕЎРАПЕЙЦЫ”

Па-першае, я віншую Мілінкевіча. Па-другое, для Беларусі гэта падзея такога маштабу, якая сведчыць, што мы еўрапейцы. Мы павінны, быццам бы, ганарыцца тым, што праз Мілінкевіча нас прызналі за нармальных людзей. Але гаворка ўсё-ткі не пра Афрыку, а пра Еўропу. І сам факт, што дыктатура ў Беларусі яшчэ існуе – праблема не толькі наша. Гэта еўрапейская праблема. Гэтыя некалькі дзясяткаў тысяч еўра выдзяляюцца не асабіста Мілінкевічу, а беларускай апазіцыі. А на аранжавую рэвалюцыю ва Ўкраіне Еўрасаюз выдзеліў мільярд еўра. Я вельмі рады, што Мілінкевіч спадабаўся цывілізаваным еўрапейцам. Дзякуючы гэтаму, ён будзе прадстаўляць Беларусь як частку еўрапейскай цывілізацыі. Мілінкевіч рызыкаваў, ён атрымаў узнагароду заслужана. Але гэтая прэмія сведчыць пра тое, што нас лічаць за тубыльцаў, якія толькі гадоў праз 500 будуць здольныя нешта тут стварыць. Што на гэта можна сказаць? Хай Еўропа не расслабляюцца. Яшчэ невядома, хто каму будзе прэміі даваць “За свабоду думкі”.

**ГАННА, ПЕНСІЯНЕРКА:**

## “А ЧАМУ НЕ КАЗУЛІНУ?”

У мяне да гэтай прэміі стаўленне адназначна адмоўнае. Што зрабіў Мілінкевіч? Пабыў у ролі кандыдата. Выступіў па тэлебачанні. Пасядзеў 15 сутак. І праехаўся па еўрапейскіх сталіцах. І за гэта даваць прэмію? А чаму не Казуліну, які сядзіць у турме?

**АЛЕСЬ МІХАЛЕВІЧ, НАМЕСНІК СТАРШЫНІ БНФ:**

## “ПРЫЗНАННЕ ЗА МЯЖОЙ МАЕ ВЕЛІЗАРНАЕ ЗНАЧЭННЕ”

Я лічу гэта вельмі важным. Бо, напрыклад, у 1980-я гады аўтарытэт лідэра польскай “Салідарнасці” Леха Валенсы ў свеце трымаўся на тым, што ён атрымаў Нобелеўскую прэмію міру. Прызнанне за мяжой мае велізарнае значэнне для палітычнай дзейнасці ў Беларусі. На жаль, такая ў нас сітуацыя – каб быць прызнаным унутры краіны, трэба, каб спачатку цябе прызналі за мяжой. Пра Казуліна ніхто не забываецца. Казулін вельмі мужны чалавек, але Мілінкевіч – адзіны кадыдат аб’яднаных дэмакратычных сіл, гэта незалежны кандыдат ад беларускага грамадства.

**АНАТОЛЬ ЛЯЎКОВІЧ, СЯБРА БСДП “ГРАМАДА”:**

## “МЫ НЕ БАЧЫМ ТУТ АЦЭНКІ НАШАЙ ДЗЕЙНАСЦІ”

Лічу, што прэмія, якую атрымаў Мілінкевіч, не зусім персанальная, хоць яна присуджаная аднаму чалавеку. Гэта ацэнка еўрапейскай супольнасцю дзейнасці аб’яднаных дэмакратычных сіл. Хаця, як вядома, выбарчая кампанія вялася дзвюма калонамі. І вядома, што наша партыя вяла ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна. Мы не бачым тут ацэнкі нашай дзейнасці. Тым больш, пасля таго, як былі рэпрэсаваныя некалькі паплечнікаў Аляксандра Казуліна, а сам ён асуджаны на пяць з паловай гадоў турмы, дзе зараз трымае бестэрміновую галадоўку. Таму, з аднаго боку, я рады, што адзначаюць беларускую дэмакратычную апазіцыю. А з іншага боку, я спадзяюся, што кіраўнікі дэмакратычных сілаў улічаць маю думку адносна Казуліна і зробяць высновы.

**УЛАДЗІМІР, ЛЕКАР:**

## “ПРЭМІЮ ЁН ЗАСЛУЖЫЎ”

У мяне гэтая падзея не выклікае ніякай іроніі ці жадання пакпіць, як у некаторых маіх знаёмых. Я абедзьвюма рукамі – за. І лічу, што Мілінкевіч зрабіў больш, чым мог зрабіць. Сакавік гэта паказаў. А ўсім скептыкам ды “іраністам” хочацца сказаць – рызыкніце супрацьпаставіць сябе Лукашэнку. І зрабіце хаця б дзясятую долю таго, што зрабіў Мілінкевіч. Так што прэмію гэтую ён заслужыў.

# ДЗЯДЫ-2006



**Шэсце ў Курапатах** — *месцы масавых сталінскіх расстрэлаў. Мінск, 29 кастрычніка.*

# "ЗА СВАБОДУ ДУМКІ"

Прэмія "За свабоду думкі", якая носіць імя праваабаронцы акадэміка Андрэя Сахарава, была заснаваная Еўрапарламентам у 1988 годзе. Прэмія ў 50 тысяч еўра прысуджаецца штогод за "дасягненні ў справе абароны правоў чалавека і яго асноўных свабод, а таксама за павагу да міжнароднага права і развіццё дэмакратыі". Намінантаў на прэмію вылучаюць дэпутацкія фракцыі Еўрапарламента альбо група дэпутатаў колькасцю не менш за 25 чалавек. «У часе апошніх прэзідэнцкіх выбараў, якія былі прызнаныя міжнароднай супольнасцю несвабоднымі і несправядлівымі, Аляксандр Мілінкевіч меў адвагу асабіста кінуць выклік Аляксандру Лукашэнку", — заявіла фракцыя Народнай партыі ў Еўрапарламенце, якая вылучыла беларускага палітыка на прэмію 2006 году.

Летась прэмія была падзеленая паміж трыма намінантамі. Гэта кубінская праваабарончая група пад назвай Damas de Blanco ("Жанчыны


**Аляксандр Мілінкевіч** *падчас ушанавання памяці братоў Каліноўскіх. Свіслацкі раён, 29 лістапада 2006 году.*

ў белым"), адвакат з Нігеры Хаўі Ібрагім і журналісцкая праваабарончая арганізацыя Reporters without Frontiers ("Рэпарцёры без межаў").

А ў 2004 годзе прэміяй Сахарава была ўганараваная Беларуская асацыяцыя журналістаў. Той факт, што за кароткі час прэмія ўжо другі раз прысуджаецца прадстаўнікам Беларусі, гаворыць сам за сябе. Зразумела і тое, што гэты факт выклікаў непрыхаванае раздражненне афіцыйнага Мінска. Так старшыня КГБ Сухарэнка заявіў журналістам: "Відаць, збяднела Еўропа, калі больш няма каму даваць прэмію. Мне як адказнай асобе гэта незразумела". А сакратар Цэнтрвыбаркама Лазавік назваў прысуджэнне прэміі "еўрадыбілізмам". Абодвум чыноўнікам, нагадаем, забаронены ўезд у краіны Еўрасаюза.

Варта дадаць, што першую сваю прэмію ЕС у 1998-м годзе прысудзіў тагачаснаму прэзідэнту Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Нэльсану Мандэле, які больш за дваццаць гадоў свайго жыцця правёў за кратамі. Наступным лаўрэатам стаў Аляксандр Дубчак – колішні першы сакратар ЦК КПЧ. Сярод лаўрэатаў можна згадаць лідэра дэмакратычнай апазіцыі М'янмы Аўн Су Чжы (1990), якая ўжо вельмі доўгі час застаецца пад хатнім арыштам, лідэра косаўскіх албанцаў Ібрагіма Ругову (1998), Арганізацыю аб'яднаных нацыяў (2003).

**Паводле СМІ**

# З ГАЛАДОЎКІ – У РЭАНІМАЦЫЮ

***Супрацоўніца бабруйскага прадпрыемства "Белшына" Алена Захожая, якая чатыры тыдні трымала галадоўку, 31 кастрычніка страціла прытомнасць на сваім рабочым масцы і была дастаўленая ў бальніцу. Захожая дамагаецца рэгістрацыі незалежнага прафсаюза на "Белшыне".***

Раней у Мінску ў рэанімацыю патрапілі некалькі верніц пратэстанцкай царквы "Новае жыццё". Некалькі дзясяткаў чалавек ад 5-га кастрычніка трымалі галадоўку-пост у храме, будынак якога маюць намер забраць гарадскія ўлады. Пасля таго, як узнікла рэальная пагроза жыццю ўдзельнікаў галадоўкі, вернікі вырашылі спыніць яе. У бліжэйшы месяц справа аб маёмасці павінна быць перагледжаная ў Вышэйшым гаспадарчым судзе Беларусі, які раней адмовіўся быў разглядаць скаргу пратэстантаў на дзеянні Мінгарвыканкама і гарадскога гаспадарчага суда.

1 лістапада супраць вернікаў здзейсненая правакацыя: невядомыя ўначы аблілі сцяну царквы "Новае жыццё" чорнай фарбай і пакінулі надпіс "Не – таталітарным сектам!"




Тым часам у калоніі "Віцьба-3" трымаюць бестэрміновую галадоўку экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін і былы дэпутат нацыянальнага схода Сяргей Скрабец. Генеральны пракурор Міклашэўскі паведаміў журналістам, што Казулін змешчаны у медчастку, але кіраўніцтва калоніі абвяргае гэты факт. Адвакату Казуліна было адмоўлена ў сустрэчы з падабаронным.

# “КАЛІ З РЭЖЫМАМ ЗМАГАЕЦЦА ТОЛЬКІ АПАЗІЦЫЯ – ЯНА АСУДЖАНАЯ НА ПАРАЗУ. КАЛІ ПАЧЫНАЕ ЗМАГАЦЦА НАРОД – АСУДЖАНЫ РЭЖЫМ”

## ПАЛІТЗНЯВОЛЕНЫ ПАВЕЛ СЕВЯРЫНЕЦ АДКАЗАЎ НА ПЫТАННІ САЙТА РАДЫЁ СВАБОДА

— Вітаю, Павел. Які найбольш пазітыўны досвед ты атрымаў за часы адсідкі ў Сітне? (Павел Севярынец адбывае пакаранне ў выглядзе папраўчых работ у вёсцы Малое Сітна. На пытанні ў інтэрнэце ён адказваў падчас паездкі дамоў на выходныя – рэд.)

*— Найбольш каштоўны пазітыўны досвед – досвед беларускае салідарнасці. 311 наведнікаў і 623 лісты (на гэты момант) – для мяне цэлы інтэрактыўны ўніверсітэт. Падлічыў, што на волі маё кола звычайна абмяжоўвалася некалькімі дзясяткамі сталых (і ў асноўным тэлефонных) суразмоўнікаў, а тут – сотні жывых людзей і найцікавейшых допісаў! Вельмі ўдзячны ўсім, хто піша і прыязджае.*

— Павел, ты рэгулярна пішаш, а ці ёсць час самому чытаць? Якія кнігі прачытаў апошнім часам? Што параіш іншым?

*— Апошнія тыдні чытаў “Старажытную беларускую літаратуру”, “Усяленскія саборы” Карташова, “Пераступіць парог надзеі” Яна Паўла II, новыя даследаванні Андрэя Катлярчука, “Сем гадоў Адраджэння” Сяргея Навумчыка, выбарчы кодэкс і хрысціянска-дэмакратычны нумар “Спадчыны”. Што параю? Дарагія беларусы, чытайце Біблію на роднай мове! Гэта самае глыбокае вымярэнне беларускай нацыянальнай ідэі. Раю паболей чытаць гістарычнай і духоўнай літаратуры – ад Тураўскага, Скарыны, Воляна да Быкава, Арлова і Пазняка. Беларусы маюць быць знаўцамі Міцкевіча, Дастаеўскага, Сянкевіча, Мілаша. З замежных раю “Сын Чалавечы” Аляксандра Меня, “Малітвы на возеры” Мікалая Сербскага (праваслаўныя), “З Богам у Расіі” вязня ГУЛАГа, езуіта Вальтара Цішэка, “Любоў і адказнасць” Яна Паўла II (каталіцкія), “Настаўленні ў хрысціянскай веры” Жана Кальвіна й “Разважанні над Евангеллямі” Джона Райла (пратэстанцкія), айцоў царквы, перадусім Аўрэлія Аўгусціна.*



**Павел Севярынец**. ***Вёска Малое Сітна, верасень 2006 году.***

— Які, на Вашае меркаванне, будзе прысуд Вашаму сябру і паплечніку Змітру Дашкевічу? Ці ў Сітне з людзьмі вы абмяркоўваеце гэтае пытанне і як да гэтага ставяцца людзі? Якімі справамі Вы зараз заняты, як ваша літаратураная праца?

*— Які б прысуд ні абвясцілі Змітру Дашкевічу, я перакананы: ён вытрымае, а «Малады Фронт» на хвалі салідарнасці толькі ўзмацніцца. У Сітне людзі ведаюць пра гэты суд, абураюцца (бо і незарэгістраваны школьны бацькоўскі камітэт, і збіральнікі брусніцаў падпадаюць пад 193-ці артыкул Крымінальнага кодэксу)... Што раблю? Працую, пішу, адукоўваюся, малюся.*

— Як Вы ставіцеся да сённяшняга становішча ў аб’яднаных дэмакратычных сілах? Што трэба, на Ваш погляд рабіць, каб перамагчы? Ці верыце вы ў перамогу?

*— Становішча ў аб’яднаных дэмакратычных сілах складанае. Веры, волі, духу вобмаль. Трэба гуртаваць моладзь, прадпрымальнікаў, хрысціянаў, укараняць нацыянальны рух у самай народнай гушчыні і працаваць, працаваць, працаваць. Не перажоўваць соты раз на семінарах адных і тых актывістаў, а штодня пашырацца за кошт новых людзей, самакіроўных ініцыятываў і кампаніяў нацыянальнага маштабу. Калі з рэжымам змагаецца толькі апазіцыя – яна асуджаная на паразу. Калі пачынае змагацца н а р о д – асуджаны рэжым. Таму ў перамогу трэба верыць. Мы пераможам рана ці позна – але ж не хочацца губляць час.*

— Як Вы лічыце, ці шмат зараз робіцца дэмакратамі, у тым ліку і Маладым Фронтам, для перамогі? Вашае меркаванне аб палітычным стане ва Ўкраіне, дзе да ўлады прыйшоў Януковіч? Як Вы лічыце, якімі павінны быць адносіны Беларусі і Расіі ў будучыні? Ці розніцца Вашыя меркаванні аб расійскай уладзе і простых расійцах? Ці лічыце Вы, што Мілінкевіч павінен заставацца лідэрам Аб’яднаных дмакратычных сіл?

*— Для перамогі зараз робіцца яўна недастаткова. Разам з тым, Малады Фронт і хрысціяне вераць у перамогу і змагаюцца, а многія апазіцыйныя структуры самазахоўваюцца ды “адбываюць нумар”. Гістарычны і нацыятворчы фенамен Майдану канчаткова зрабіў Украіну Ўкраінай. Прэм’ер Януковіч – непазбежная карэкцыя пасля аранжавага геапалітычнага рыўка (інерцыю яшчэ ніхто не адмяняў). Дэмакраты расчаравалі, але будучыня Ўкраіны – за асобамі кшталту Юліі Цімашэнкі.*

*…Тысячы гадоў сваёй гісторыі Беларусь спрабавала змяніць, падкрэсліваю, з м я н і ц ь Усход, уплываць на яго духова, культурна і палітычна, ажыццяўляць тут асвету, евангелізацыю і дэмакратызацыю. Таму і будучая беларуская ўсходняя палітыка бачыцца мне не як “жалезная заслона”, а як шырокая экспансія з мэтаю збавіць народы Расіі ад імперскіх комплексаў і цемрашальства. А расійскую ўладу і жыхароў Расіі, вядома, адрозніваю – гэтак жа, як і беларускі рэжым і ўласна беларусаў.*

*Лідэрам беларускай ідэі дагэтуль застаецца Зянон Пазняк (Мілінкевіч наследуе яму), а лідэрам беларускай дэмакратыі ёсць Аляксандр Мілінкевіч (Пазняк адасобіўся ад аб’яднаных дэмакратычных сілаў). Нацыянальны рух мусіць пераадолець гэтую супярэчнасць узаемадапаўненнем ды ўзаемападтрымкай – тады аб’яднаныя дэмакратычныя сілы здолеюць зрабіцца моцным грунтам для незалежніцкай еўрапейскай беларускай палітыкі.*

— Калі сканчаецца тэрмін твайго пакарання?

*— Тэрмін майго пакарання сканчаецца 15 жніўня наступнага году.*

*Уражаны моцнай падтрымкай… Дарагія беларусы, дзякуй вам!. Будзьце разам, будзьце гэтак жа салідарныя ў любым моманце беларускай прасторы і часу. Сам буду імкнуцца з Божай дапамогай апраўдаць вашыя спадзяванні і зрабіць усё, каб Беларусь урэшце сталася вольнай, незалежнай, дэмакратычнай і хрысціянскай краінай.*

**Паводле**
**www.svaboda.org**
*Друкуецца ў скароце*

# АТАМНЫ ПРЫВІД

## БЕЛАРУСЬ ХУТКА СТАНЕ ЯДЗЕРНАЙ ДЗЯРЖАВАЙ?

Праз 20 год пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС афіцыйны Мінск вырашыў пабудаваць уласную атамную электрастанцыю. Яе першы блок павінен пачаць працу ў 2015 годзе.

Зусім нядаўна на стужцы агенцтва БЕЛТА з'явіўся артыкул пад назвай "Белорусская АЭС: больше pro, чем contra". Аўтар тэксту пераконвае суайчыннікаў, што альтэрнатывы атамнай энергетыцы няма.

Цікавым і сімвалічным выглядае тое, што ўрадавае агенцтва распавядае пра небяспеку, што зыходзіць... ад галоўнага хаўрусніка Беларусі – Расіі. Раптам высветлілася, што энерганосьбіты мы атрымліваем з адной крыніцы. У звязку з гэтым згадваецца і пра тое, як пару гадоў таму ў сярэдзіне зімы "Газпром" адключыў падачу газу ў нашую краіну, і пра больш свежую падзею – скарачэнне паставак нафты кампаніяй "Роснефть".




**Пікет супраць** *будаўніцтва АЭС. Мінск, 20 красавіка 2006 году*

Сапраўды, калі "Газпром" будзе паводзіць сябе ў дачыненні да Беларусі прыкладна, як "Белпошта" і "Белсаюздрук" – з незалежнымі газетамі, наша краіна трапляе ў складанае становішча.

Але вернемся да абгрунтавання пабудовы АЭС. Паколькі не ўсе грамадзяне Беларусі бяруць да галавы клопат пра лёс "Нафтана" ці БМЗ, ім падкідваюць яшчэ адзін аргумент: імавернае істотнае падвышэнне платы за жыллёва-камунальныя паслугі. Гэта ўжо тычыцца практычна ўсіх.

Далей малюецца карціна дабрабыту, які чакае Беларусь пасля таго, як АЭС пачне працаваць: гэта і танная электраэнергія, і экалагічныя выгоды, і шмат чаго яшчэ. Усе астатнія варыянты абвяшчаюцца не вартымі ўвагі. Паводле БЕЛТА, і маштабныя праграмы энергаашчаджэння, і альтэрнатыўнае паліва, і выкарыстанне энергіі сонца ды ветру, здольныя вырашыць праблему толькі часткова. А вось АЭС... Карацей кажучы, паўтараецца гісторыя дзесяцігадовай даўніны, калі ўлады не жадалі чуць пра альтэрнатыўныя магчымасці ў энергетыцы.

Атамны прывід, хваласпеў якому ўжо ладзяць дзяржпрапагандысты, паступова становіцца рэальнасцю. На мінулым тыдні першы намеснік гендырэктара канцэрна "Белэнерга" Аляксандр Сівак падчас візіту на Калінінскую АЭС назваў меркаваную дату пуска першага атамнага энергаблоку ў Беларусі – 2015 год. Смешнымі выглядаюць рэверансы чыноўніка наконт неабходнасці параіцца з жыхарамі тэрыторыі, на якой будзе будавацца атамная электрастанцыя. Што б яны ні сказалі, дата ўжо вызначаная. І партнёр па будаўніцтву таксама: Сівак заявіў, што прыярытэт будзе аддадзены Расійскай Федэрацыі. Такім чынам, на беларускай АЭС замест сучасных і дасканалых заходніх тэхналогій будуць выкарыстоўвацца больш танныя расійскія. Такім чынам, Беларусь дагоніць у сваім атамным развіцці Іран.

Зрэшты, пярэчанняў большая частка грамадзянаў Беларусі не выказвае. Хоць атамны гром ужо аднойчы грымнуў над нашай краінай, мужык па-ранейшаму не перахрышчваецца.

**Віктар Філін**

# АПЕРАЦЫЯ "БЕЛЫ ПАРАШОК"

## УЛАДА ПРАЦЯГВАЕ АКЦЫІ ЗАПАЛОХВАННЯ І ДЫСКРЭДЫТАЦЫІ АПАЗІЦЫІ

*29 кастрычніка ўвечары на памежным пераходзе Прывалка пры праверцы аўтамабіля, у якім вярталася з Вільні старшыня Саюза палякаў Беларусі Анжаліка Борыс з калегамі, мытнікі нечакана знайшлі ў адным з люстэркаў некалькі пакецікаў з белым рэчывам.*

Анжаліку Борыс і яе спадарожнікаў, актывістаў Саюза палякаў Анджэя Лісоўскага, які быў за рулём машыны, і Тэрэзу Селівончык абшукалі, пасля чаго даставілі ў Гродна. Там у абласным псіханеўралагічным дыспансеры іх прымусілі здаць аналізы крыві на ўтрыманне наркатычных рэчываў.

Знойдзеныя пакеты з белым парашком былі накіраваныя на экспертызу, аўтамабіль "Аўдзі", які належыць Лісоўскаму сканфіскаваны для "далейшых следчых дзеянняў".

Мы звязаліся з Анжалікай Борыс па тэлефоне ў панядзелак, калі яна была ўжо дома. У размове старшыня Саюза палякаў (улады, якія правялі летась незаконны з'езд гэтай арганізацыі, факт старшынства Борыс не прызнаюць) выказала упэўненасць, што гісторыя будзе мець працяг. Анжаліка Борыс расцэньвае інцыдэнт як правакацыю. "Нас вельмі доўга правяралі на мяжы, пакуль "раптам" не знайшлі гэты парашок, — распавяла спадарыня Борыс – але нам ён не належыць". Знойдзеныя пакецікі былі загорнутыя ў чыстую анучку белага колеру. Аднак у той дзень ішоў дождж, і калі б анучка ляжала ў вонкавым люстэрку, на яе, безумоўна, патрапілі б вільгаць і бруд.

Анжаліка Борыс перакананая, што гэтая правакацыя скіраваная супраць яе і іншых актывістаў непрызнанага ўладамі Саюза палякаў з мэтай маральна зламаць яе саму і яе калегаў. Пазней у інтэрвью прэс-цэнтру "Хартыі-97" Борыс сказала, што супраць яе "могуць пачаць крымінальны працэс, скампраметаваць. Такія ў афіцыйнага Мінска метады. Але калі яны такім чынам дзейнічаюць у адносінах да грамадскай арганізацыі, яе лідэра, урэшце, у адносінах да жанчыны, гэта гаворыць толькі аб іхнім бяссіллі".

Нагадаем, што гэта не першае затрыманне старшыні Саюза палякаў. Актывістаў непрызнанага СПБ не аднойчы затрымлівалі па розных надуманых прычынах.

Як стала вядома, следствам у справе "белага рэчыва" займаецца КГБ. Следчы ўжо заявіў для прэсы, што гэта наркотык – амфетамін з дабаўленнем гашыша. Яшчэ адзін прадстаўнік праваахоўчых органаў казаў таксама пра гераін – яшчэ больш моцны наркотык. Борыс выклікалі на допыт у якасці сведкі па справе. Галоўным падазраваным названы кіроўца аўтамабіля, у якім знайшлі тайнік, А. Лісоўскі. "Справа аб наркотыках" раскручваецца?

**Алег Ман**

“Саюздрук”

# “ПРАДСТАЎНІКІ ЧАЛАВЕЦТВА” І “ЖЫХАРЫ СНД”

## АЛЬБО НЕГАТОВАСЦЬ ДА СВАБОДЫ ЯК ЗАРУКА ДАБРАБЫТУ“

“Тупики крестового похода за демократию”. Так названы артыкул акадэміка Анатоля Рубінава ў “Советской Белоруссии”. Нястомны ідэолаг не шкадуе красамоўства і газетнай плошчы, каб давесці чытачам і самому сабе правільнасць шляху, па якім ідзе краіна ад 1994-га году:

*“… демократическая культура возникает не в один день. Поэтому свобода должна предоставляться обществу настолько, насколько оно готово нести за нее ответственность. Если же уровень свободы превышает меру ответственности, то это приводит к дестабилизации общества и может иметь разрушительные последствия”.*

Вось дзе, аказваецца, галоўная пагроза для Беларусі! У негатовасці да сабоды. Цікава, хто, на думку акадэміка, павінен вылічваць тую дозу свабоды, якую беларусы, нягледзячы на іхную паталагічную безадказнасць, здольныя пераварыць? Не іначай, сам спадар Рубінаў.

А палітолаг Юры Шаўцоў у інтэрвію “Звяздзе” разважае над вырашэннем дэмаграфічнай праблемы ў Беларусі.

**“— А які ваш уласны прагноз на наступныя 20 гадоў?**

*— Будзе працягвацца старэнне і скарачэнне насельніцтва, пры гэтым удасца затрымаць тэмпы распаду сям’і як сацыяльнага інстытута (ёсць шанцы, што царкоўныя арганізацыі, дзяржаўныя інстытуты здолеюць гэта зрабіць, дапаможа нам і існуючая ў Беларусі сістэма рассялення людзей: вялікі мегаполіс Мінск не вельмі падаўляе іншыя гарады і рэгіёны, пераважная большасць насельніцтва нашай краіны пражывае ў невялікіх гарадах і населеных пунктах), аднак у цэлым мы будзем ісці ў агульнаеўрапейскім кантэксце. Хутчэй за ўсё пры тых тэмпах эканамічнага росту, што мы маем, нам спатрэбяцца вялікія масы рабочых. Давядзецца прымаць імігрантаў, такая практыка характэрна для ўсіх развітых краін. Нам выпадзе прымаць у асноўным славян з Украіны, Расіі”.*

Не зусім разумею шаноўнага навукоўца. Пра якія тэмпы эканамічнага росту вядзецца гаворка? Мо беларусы будуць яшчэ больш перапрацоўваць таннай нафты і здабываць калійных угнаенняў? Ці няшчасныя расіяне кінуцца ўладкоўвацца на зборку іранскіх аўтамабіляў? Альбо згаладалыя ўкраінцы запоўняць беларускія аграгарадкі?

І чаму, урэшце, толькі славянаў будуць прымаць на працу? Няўжо беларускія памежнікі будуць вымяраць чарапы ў гастарбайтэраў? (Дарэчы, калі гаварыць сур’ёзна, дык навукоўцы-антраполагі нядаўна высветлілі: генатып пераважнай колькасці беларусаў сапраўды адпавядае славянскаму. У адрозненне ад рускіх, у якіх пераважае набор генных прыкметаў, больш характэрных для цюркскіх народаў.)

У “Голасе Радзімы” надрукаваны артыкул сацыёлага Людмілы Навуменкі. Тэма для нашай айчыннай сацыялогіі старая – змены беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці.

*“Людзі сталага ўзросту часцей самавызначаюць сябе як “савецкі чалавек”, “жыхар Беларусі”, “грамадзянін Беларусі”, “жыхар СНД”. Пры гэтым маладое пакаленне часцей усведамляе сябе еўрапейцамі і прадстаўнікамі чалавецтва ў цэлым.*

*Адказ на пытанне “Што для вас азначае — быць беларусам?” дазволіў выдзеліць такія катэгорыі, як этнічнасць (26,64 працэнта), Беларусь як Радзіма, краіна, родная зямля і агульная тэрыторыя, месца жыхарства (21,85 працэнта), культура (18,41), грамадзянства (8,97), імкненне да дзейнасці на карысць Беларусі (8,47), рэлігія (0,37)”.*

Сумна, што сярод апытаных няма тых, для каго беларускасць увасабляецца найперш у родным слове. (Ці пры фармулёўцы пытанняў сацыёлагі забыліся пра гэты складнік нацыянальнай тоеснасці?)

Вось і атрымліваецца, што маладыя “прадстаўнікі чалавецтва ў цэлым” выглядаюць у гэтай сацыялагічнай карціне нават большымі саўкамі, чым іхныя бацькі.

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# ГОЛАС ПРАЎДЫ – МУЖНЫ

## АЛЬБО ЗА КІМ БУДЗЕ РАЦЫЯ?

За што я люблю радыё? Яно дае рэальныя галасы рэальных людзей. Вось, напрыклад, 24 кастрычніка на Радыё Рацыя прагучаў матэрыял Сяргея Будкіна пра фальшывыя даляры, якія падкінулі ветэрану-афганцу Камароўскаму. У рэпартажы даецца голас тэлекаментатара БТ – з’едлівы, здзеклівы, подленькі і голас пацярпелага, спадара Камароўскага – цвёрды, упэўнены, сапраўдны мужчынскі голас. І ўжо толькі па гэтых галасах можна без сумнення вызначыць, на чым баку праўда.

Працягваецца гераічнае змаганне вернікаў царквы “Новае жыццё” за свой храм. Яшчэ 14 кастрычніка была на Радыё Свабода перадача “Сымбаль веры”. У ёй вядучы Сяргей Абламейка задаў пытанне дзяржаўнаму чыноўніку: якія прэтэнзіі да вернікаў? І той са сваімі казёнными аргументамі заявіў: яны не аформілі належным чынам дакументацыю – архітэктурны праект перабудовы і іншае, не прайшлі пажарнікаў і санстанцыю. З таго часу мінула ўжо паўмесяца, кожны дзень на ўсіх недзяржаўных радыёстанцыях гучаць рэпартажы пра гэтую царкву, але ніхто не даў вернікам магчымасці адказаць таму чыноўніку. Напэўна ж яны спрабавалі ўсе свае дакументы прывесці да ладу. Але фармальна рацыя засталася за чыноўнікам. Слухачам жа застаецца толькі здагадвацца.

Моўныя перлы. 25 кастрычніка на Еўрапейскім Радыё Віталь Малькевіч казаў пра “тканіны з поўсці”. Яно так, рускае слова “шерсть” на беларускую перакладаецца “поўсць”, але з адным выключэннем. Авечая поўсць, з якой робяць тканіну, называецца “воўна” і таму тканіны з яе – ваўняныя.

**Сяржук Вітушка**

# ГОТ МІТ УНС

## Стрэмкі

Рэлігійны рэнесанс набірае моц. Рэстаўруюцца старыя храмы, вырастаюць новыя, з сілікатнай цэглы і жалезабетону. У школах настаўнікі ўжо не зрываюць з дзяцей нацельныя крыжыкі, як у часы майго школьнага дзяцінства. Наадварот, святар у школе – часты і пажаданы госць. Палітыкі ўсіх рангаў дэманструюць сваю набожнасць.

Лагічна было б чакаць, што маральны клімат, колькасць "узаемнай любові", пра якую гаворыць хрысціянства, павінна ўзрастаць. На справе ўсё адбываецца з дакладнасцю да "наадварот". Па ўсім свеце.

Славуты лідэр "Салідарнасці" і былы прэзідэнт Польшчы Лех Валэнса настолькі набожны, што загадаў у прэзідэнцкім палацы зладзіць каплічку, каб у любы момант раіцца з Усявышнім.

Цяперашні прэзідэнт Лех Качыньскі таксама на кожным кроку дэманструе сваю рэлігійнасць.

Тым не менш, абодва паны настролькі не зносяць адзін аднаго, што нават падчас святкавання ўгодкаў "Салідарнасці" старанна пазбягалі хоць бы выпадковай сустрэчы. Гэткая вось у іх "любоў да бліжняга".

Калі Сталін загадаў узарваць у Маскве храм Хрыста Збаўцы, гэта быў акт вандалізму.

Калі хрысціянін Пілсудскі тое самае зрабіў з праваслаўным саборам у Варшаве, гэта быў акт патрыятызму.

Калі каталік абражае праваслаўнага Хрыста, ці наадварот, — гэта грэх ці не?

Няпрыязь патрыярха РПЦ Алексія II да свайго калегі Яна Паўла II перарастала рамкі не толькі хрысціянскай, але й чалавечай прыстойнасці.

Вядомы сучасны іканапісец святар Зінон быў сурова пакараны сваімі праваслаўнымі ўладамі за тое, што ён адправіў службу супольна з каталіцкім ксяндзом.

Іншы праваслаўны святар паплаціўся за тое, што з ксяндзом разам... збіраў грыбы!

Я меў знаёмага ў Польшчы, чалавека рахманага і сапраўды гатовага дапамагчы ў любы момант. Але куды дзявалася яго дабрыня, калі ён гаварыў пра ксяндзоў? Бач, мой прыяцель належыць да "сведкаў Еговы".

Іншы мой калега раз-пораз прапануе мне "пакаяцца" і далучыцца да ягоных братоў-пяцідзясятнікаў. Маўляў, Бог з імі, і толькі з імі.

"После выхода в свет книги «Теория богочеловеческой цивилизации» меня буквально завалили просьбами поподробнее рассказать, каким образом Россия исполнит предопределенную ей Богом миссию объединения человечества в единый народ Божий», — цешыцца публіцыст Віталь Розе ў "Литературной газете".

Бядак, мабыць, ніколі не слухаў беларускай "Свабоды", дзе лідэры апазіцыі даводзяць: Бог з намі, пад бел-чырвона-белым сцягам!

І няхай сабе мітрапаліт Філарэт добра пастаўленым зычным голасам пераконвае: Бог з Лукашэнкам!

А я вось неяк падумаў: а хто такія хрысціянскія дэмакраты? Наколькі мне вядома, Хрыстос выказваўся пра дэмакратыю столькі ж, колькі Маркс і Энгельс – пра кіно.

І сам дэмакратам не быў...

Ну, вядома, дзесяць прыказанняў, — але пакажыце мне палітыка з любой партыі, які скажа, што ён іх не шануе? Нават камуністы іх перайначылі на "маральны кодэкс".

"Gott mit uns" – "З намі Бог" – хто толькі гэтага не сцвярджаў – ад крыжакоў да салдафонаў XX стагоддзя. І рэзалі, нішчылі хрысціяне хрыціян... А можа, пакіньма Богу права самому вырашаць, з кім яму быць?

Бо там, дзе многа і гучна крычаць пра Бога, моўчкі кіруе д'ябал...

**Алег Аблажэй**

## ФОТАФАКТ



**Прэзентацыя калекцыяў** *італьянскага ювеліра Паскуале Бруні ў будынку Белдзяржфілармоніі. Мінск, 27 кастрычніка 2006 году.*

## Невядомая Беларусь

**2 лістапада** 1939 году на пазачарговай сесіі Вярхоўнага Савета СССР у Маскве быў прыняты закон пра ўключэнне Заходняй Беларусі ў склад Савецкага Саюзу і ўваходжанне яе ў Беларускую ССР. Цікава, што ў складзе Заходняй Беларусі тады былі гарады Вільня і Беласток, якія сёння належаць адпаведна Літве і Польшчы.

**3 лістапада** 1882 году нарадзіўся Якуб Колас — народны паэт Беларусі.

**5 лістапада** 1794 году расійскія войскі пад кіраўніцтвам А.Суворава бяруць штурмам Варшаву і ўчыняюць там расправу над паўстанцамі. Такім чынам вызвольнае паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, якое адбывалася на тэрыторыі сучаснай Беларусі, было канчаткова знішчанае. На знак падзякі за гэта Сувораў атрымаў ад імператрыцы Кацярыны II Кобрынскую воласць ды іншыя беларускія землі, а яшчэ – больш за 13 тысяч душ прыгонных сялян.

**8 лістапада** 1883 году прыйшоў на свет Вацлаў Ластоўскі – палітык, выдавец, гісторык і літаратар. Калі пералічыць ягоны жыццёвы даробак, можна падумаць, што гэта не адзін чалавек працаваў, а цэлая Акадэмія Навук з цэлым Саюзам Пісьменнікаў разам. Ён быў сакратаром газеты "Наша Ніва", выдаў першую "Кароткую гісторыю Беларусі", пасля быў рэдактарам газеты "Гоман" і часопіса "Крывіч", пісаў апавяданні і аповесці, апублікаваў "Падручны расейска-крыўскі (беларускі) слоўнік" і фундаментальную "Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі"... І пры гэтым усім узначальваў урад БНР, за што пры паляках трапіў у турму, працаваў у міністэрстве беларускіх справаў у міжваеннай Літве, у Коўне. Адтуль перабраўся ў Мінск, быў дырэктарам беларускага дзяржаўнага музея. У 1937-м савецкія карныя органы выслалі Ластоўскага ў Саратаў і там расстралялі.







**МАТЭРЫЯЛЫ ПАД ГЭТЫМІ ДЫ ІНШЫМІ ПАСТАЯННЫМІ РУБРЫКАМІ ГАЗЕТЫ ВЫ МОЖАЦЕ ЧЫТАЦЬ НЕ ТОЛЬКІ НА СТАРОНКАХ НЕЗАЛЕЖНАЙ ГАЗЕТЫ “СВАБОДА”, АЛЕ І Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА САЙЦЕ VILNIA.COM**

**ТУТ, У РАЗДЗЕЛЕ *“АРХІЎ”* ВЫ МОЖАЦЕ ТАКСАМА ЗНАЙСЦІ АПОШНІЯ НУМАРЫ НАШАЙ ГАЗЕТЫ Ў ФАРМАЦЕ PDF; ЧЫТАЙЦЕ, ДРУКУЙЦЕ, ДАЙЦЕ ПАЧЫТАЦЬ ІНШЫМ**

## “СВАБОДА” БУДЗЕ ЗА НАМІ!

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер”
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Тыраж** 299 экзэмпляраў